*Урок во всём его многообразии и во всех разновидностях — сложное педагогическое явление. На нём учитель опирается на личностное своеобразие учеников, но, кроме творческой неповторимости, мастерства, должна проявиться профессиональная компетентность педагога: знание того, какие факторы определяют смысл и сущность современного урока; умения планировать, проводить и анализировать его. Реальная ценность урока — его результат, степень усвоения материала учениками. Какими бы внешне приёмами ни пользовался педагог, но если учащиеся не усвоили тему, урок эффективным назвать нельзя.*

**Г. А. Стаскевич**, методист Ивацевичского РУМК

# Полацкае княства ў IX—XI стагоддзях

**Гісторыя Беларусі, VI клас**

**І. М. Доўжык**, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства
Руднянскай базавай школы Івацэвіцкага раёна

**Мэта:** знаёмства вучняў з найважнейшымі падзеямі на Полацкай зямлі ў IX—XI стст.

**Задачы**

1. Раскрыць прычыны, якія садзейнічалі ўзвышэнню горада Полацка, пазнаёміць вучняў з трагічным і гераічным лёсам полацкіх князёў з роду Рагвалодавічаў, паказаць іх гістарычную ролю, накіраваную на ўмацаванне Полацкага княства.
2. Развіваць у вучняў здольнасці аналізу гістарычных падзей, фарміраваць навыкі характарызаваць гістарычных дзеячаў, самастойна працаваць з падручнікам.
3. На прыкладах гераічнай барацьбы палачан пад кіраўніцтвам сваіх князёў выхоўваць у вучняў патрыятычныя пачуцці і шаноўныя адносіны да дзяржаўнай незалежнасці, у барацьбе за якую нашым продкам часта даводзілася плаціць сваім жыццём.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Забеспячэнне ўрока:** карта «Беларускія землі ў X—XIII стст.»; Штыхаў Г. В., Цемушаў С. М., Ракуць В. У. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.: вучэб. дапам. для 6-га кл.; раздатачны матэрыял.

**Новае паняцце:** *волакі.*

**Даты:** 862 г.; 1003 г.; 1021 г.; 1044—1101 гг.; 1067 г.

**План вывучэння новага матэрыялу**

1. Старажытны Полацк.
2. Саперніцтва з Ноўгарадам і Кіевам.
3. Князь Усяслаў Брачыславіч.
4. Бітва на рацэ Нямізе.
5. Найвышэйшы ўздым Полацкага княства.

## Ход урока

*I. Арганізацыйны момант.*

**Настаўнік.** Вітаю вас на чарговым уроку гісторыі Беларусі. Спадзяюся на вашу добрасумленную працу. Усё атрымаецца, калі вы будзеце ўважліва і старанна выконваць усе заданні.

*II. Праверка дамашняга задання.*

— Запоўніце карткі:

а) укажыце падзею:

1. 960-я гг. — пачатак княжання ў Полацку Рагвалода,
2. 980 г. — заваяванне Полацка наўгародскім князем Уладзімірам,
3. 988 г. — пачатак Полацкага княства, у якім правіла ўласная княжацкая дынастыя;

б) замяніце выраз паняццем:

1. *Мітрапаліт* — кіраўнік хрысціянскай царквы ў Старажытнарускай дзяржаве,
2. *Народнасць* — устойлівая супольнасць людзей, заснаваная на агульнасці мовы, тэрыторыі размяшчэння, гаспадарчага і культурнага жыцця;

в) адкажыце на пытанні:

1. Якую ролю адыгрывала ва ўсходнеславянскім грамадстве вярхоўная ўлада:

а) арганізоўвала насельніцтва для барацьбы з ворагамі;

б) здзяйсняла суд;

в) кантралявала гандаль?

2. Назавіце факты, якія сведчаць пра адзінства Старажытнарускай дзяржавы:

а) хрысціянская рэлігія;

б) княжацкі род Рурыкавічаў;

в) аднолькавая гаспадарчая дзейнасць;

г) цесныя гандлёвыя сувязі;

д) агульнае паходжанне і гістарычны лёс.

***III. Падрыхтоўка да ўспрымання новай тэмы.***

— Сёння мы пазнаёмімся з жыццём і дзейнасцю полацкіх князёў Брачыслава і Усяслава, даведаемся пра ўзаемаадносіны паміж Полацкім княствам і дзвюма суседнімі дзяржавамі: Наўгародскай зямлёй і Кіеўскім княствам, запомнім некаторыя даты і паняцці. Па ходзе вывучэння новага матэрыялу будзем заносіць у табліцу запісы пра дзейнасць князёў Брачыслава і Усяслава, накіраваную на ўмацаванне Полацкага княства. А цяпер адкажыце на пытанні:

1. Што такое каланізацыя? 2. Калі пачалася славянская каланізацыя беларускіх зямель, і калі яна скончылася? 3. Якія славянскія плямёны рассяліліся на беларускіх землях? 4. Дзе пасяліліся крывічы? 5. Які горад стаў цэнтрам крывічоў-палачан? 6. Якія першыя княствы ўзніклі на тэрыторыі Беларусі? 7. Як звалі першага вядомага полацкага князя? *(Адказы.)*

***IV. Вывучэнне новага матэрыялу.***

**1. Старажытны Полацк.**

У ходзе тлумачэння матэрыялу настаўнік паказвае на карце г. Полацк, Заходнюю Дзвіну, Балтыйскае мора. Для таго каб вучні больш грунтоўна зразумелі выключную выгаднасць геаграфічнага становішча Полацка і Полацкай зямлі, можна дадаткова ўвесці матэрыял пра беларускі водны шлях «з варагаў у грэкі». Настаўнік, карыстаючыся картай, паказвае напрамак гэтага шляху і тлумачыць яго: Скандынавія (варагі) — Балтыйскае мора — Заходняя Дзвіна — волакі — Днепр — Чорнае мора — Балканскі паўвостраў (грэкі). Запісваецца дата 862 г. — першае летапіснае ўпамінанне пра Полацк.

Затым увага вучняў пераключаецца на план горада Полацка (с. 81). Па гэтым матэрыяле настаўнік праводзіць гутарку з вучнямі.

— Назавіце месца, на якім зараджаўся г. Полацк. Як называліся асноўныя ўмацаванні горада? Як быў выкарыстаны прыродны фактар для ўзмацнення абараназдольнасці Полацка? Растлумачце паходжанне назваў *гарадзішча*, *Верхні замак*, *Ніжні замак*, *Запалацце*, *Вялікі пасад*. *(Адказы.)*

**2. Саперніцтва з Ноўгарадам і Кіевам. Умацаванне Полацкага княства.**

| Брачыслаў | Усяслаў |
|---|---|
| 1. Перамога над Ноўгарадам | 1. Аслабіў магутнасць Пскова |
| 2. Далучэнне Віцебска і Усвят | 2. Перамог Ноўгарад |
| 3. Авалоданне воламі | 3. Бітва на Нямізе |
| 4. Заснаванне Браслаўля | 4. Полацкая дзяржава дасягнула найвышэйшага ўздыму |

Па гэтым пытанні настаўнік тлумачыць матэрыял з выкарыстаннем гістарычнай карты. Настаўнік паказвае на ёй наступныя геаграфічныя аб'екты: Полацк, Ноўгарад, Кіеў, Віцебск, Усвяты, Заходнюю Дзвіну, Днепр, волакі паміж імі.

Па ходзе работы над гэтым пунктам плана вучні запісваюць у сшыткі даты княжання Брачыслава (1003—1044), дату яго паходу на Ноўгарад (1021), прозвішча кіеўскага князя Яраслава Мудрага, паняцце *волакі*.

**Дадатковы матэрыял**

Пра гэты паход даведаўся кіеўскі князь Яраслаў Мудры. Перамога Полацка над Ноўгарадам была яму не даспадобы. *(Падумайце, чаму.)* Войска Яраслава рушыла наўздагон палачанам. На сёмы дзень кіяўляне дагналі Брачыслава, войска якога вярталася ў Полацк. Дзядзька (Яраслаў Мудры) і пляменнік (Брачыслаў Ізяславіч) сутыкнуліся на полі бітвы. Брачыслаў быў разбіты, здабыча адабрана, палон вызвалены і вернуты ў Ноўгарад. Сам князь з рэшткамі войска вярнуўся ў Полацк, а Яраслаў не стаў яго праследаваць. Да таго ж, паміж праціўнікамі быў заключаны мір. А вось умовы яго былі незвычайныя: пераможца Яраслаў аддае пераможанаму Брачыславу два важныя крывіцкія гарады Віцебск і Усвяты, дзе праходзілі волакі, якія злучалі Заходнюю Дзвіну з Дняпром.

— Паспрабуйце разгадаць гэту цікавую гістарычную загадку. Выберыце правільны адказ і абгрунтуйце яго.

1. Дзядзька вырашыў зрабіць падарунак пляменніку.

2. Яраслаў дзеля справядлівасці вяртаў Полацку тое, што раней яму належала.

3. Каб жыць мірна і дружна.

4. Каб пасварыць паміж сабой Полацк і Смаленск, які мог прэтэндаваць на зручныя волакі.

Пасля тлумачэння матэрыялу пункта «2» настаўнік прапануе вучням вярнуцца да лагічнага задання і ў першую графу табліцы «Умацаванне Полацкага княства» ўнесці неабходныя запісы. Вучні павінны зрабіць гэта самастойна. Настаўнік удакладняе выкананую вучнямі работу. У першую графу табліцы павінна быць запісана: 1) перамога над Ноўгарадам; 2) далучэнне Віцебска і Усвят; 3) авалоданне волакамі; 4) заснаванне Браслаўля.

**3. Князь Усяслаў Брачыславіч.**

Расказваючы пра незвычайнага князя, настаўнік асаблівую ўвагу звяртае на яго як на выдатнага і таленавітага палітычнага дзеяча. Вучні павінны ўбачыць і зразумець, як мужна і нястомна бараніў Усяслаў Полацкую зямлю ад знешняй небяспекі.

У ходзе вывучэння матэрыялу вучні запісваюць у свае сшыткі прозвішча князя і дату пачатку яго княжання (1044).

**Дадатковы матэрыял**

Самае пачэснае месца ў гісторыі Полацкай дзяржавы па праве належыць прапраўнуку Рагвалода Усяславу Брачыславічу, які стаў княжыць у 1044 г. Гэта быў мудры, мужны, вынослівы, працавіты і энергічны чалавек. Сваімі якасцямі ён здзіўляў, уражваў сучаснікаў. Многія, хто ведаў яго, нават адукаваныя людзі, ахвотна верылі, што нарадзіўся князь ад чарадзейства. Летапісы сцвярджаюць, што меў ён на галаве «чарадзейскую» прымету — радзімы знак. Лічылася, што ў ім заключалася ўся яго незвычайная сіла. Па прапанове волхваў насіў Усяслаў на галаве павязку, каб радзімы знак не кідаўся людзям у вочы.

Вось як пра незвычайнага князя расказвае невядомы аўтар «Слова аб палку Ігаравым»: «Усяслаў-князь людзям чыніў суды, радзіў князям гарады, а сам у начы ваўком рыскаў» (Слова аб палку Ігаравым, 1986, с. 144).

**4. Бітва на рацэ Нямізе.**

Ад настаўніка патрабуецца вобразны, мастацкі расказ з элементамі драматызацыі гістарычнай падзеі. Для больш паспяховага дасягнення гэтай мэты ў дадатак да падручніка можна выкарыстаць наступны матэрыял.

Ёсць у горадзе Мінску (старажытны Менск) вуліца Няміга. Носіць яна назву рэчкі, якой на карце Беларусі ўжо няма. З таго часу праляцела дзевяць з палова стагоддзяў. Перасохла Няміга і ператварылася ў невялічкі ручаёк. У наш час пусцілі яго па падземным калектары ўздоўж вуліцы. Цячэ ён у бетоннай трубе, нібыта тыя слёзы, пралітыя па загінуўшых тут у час крывавай сечы, што адбылася на берагах Нямігі 3 сакавіка 1067 г.

А было гэта так. У 1067 г. полацкі князь Усяслаў Чарадзей накіраваўся ў паход на Ноўгарад і захапіў яго. З багатай здабычай вярнуўся ён у Полацк. Змірыцца з гэтым не пажадалі сыны Яраслававы, князі Русі: Ізяслаў Кіеўскі, Святаслаў Чарнігаўскі і Усевалад Пераяслаўскі. Аб'яднаўшы свае сілы, рушылі яны на Менск.

*Галасы мінулага.* «Сабраўшы вояў, рушылі на Усяслава, калі была вялікая зіма, і прыйшлі да Менска. Ды меняне зачыніліся ў горадзе, і браты тыя ўзялі Менск, пасеклі мужчын, а жанчын і дзяцей захапілі як здабычу і пайшлі да Нямігі».

Полацкі князь Усяслаў разам з дружынай спяшаўся на дапамогу абложанаму Менску, але спазніўся. Горад ужо быў узяты, і войскі сустрэліся на Нямізе. Тут і адбылася страшная сеча. Упартасць, з якой змагаліся палачане, была надзвычай моцнай. Страты з абодвух бакоў былі вялікімі.

*З летапісу:* «...пайшлі яны адны супраць другіх. А быў снег вялікі, і адбылася сеча лютая, і палі многія (у бітве). І адолелі Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, а Усяслаў уцёк».

*Аўтар «Слова аб палку Ігаравым»:* «На Нямізе галовы сцелюць снапамі, харалужнымі малоцяць цапамі, жыццё кладуць, на таку злюцела веюць душу ад цела».

— Параўнайце гэтыя звесткі, знайдзіце ў іх адрозненні. Падумайце, якой з дадзеных крыніц можна больш давяраць? Чаму? Растлумачце, чаму аўтар «Слова...» параўноўвае бітву з земляробчымі заняткамі.

Цяжкімі стратамі абярнулася для палачан гэтая бітва. Многія з іх не вярнуліся да родных хат. Але страты Яраславічаў былі не меншымі. Пасля бітвы іх войска не стала праследаваць палачан і не рашылася ісці на Полацк.

— Падумайце, чаму. Абгрунтуйце свае меркаванні. Запішыце ў сшыткі дату бітвы на Нямізе (1067 г.).

У канцы работы над матэрыялам пункта «3» настаўнік прапануе вучням вярнуцца да лагічнага задання і ў графу «Усяслаў» табліцы «Узвышэнне Полацкага княства» ўнесці неабходныя запісы. Заданне вучні выконваюць самастойна. Настаўнік правярае правільнасць яго выканання.

У вучнёўскіх сшытках павінна быць запісана: 1) аслабіў магутнасць Пскова; 2) перамог Ноўгарад; 3) бітва на Нямізе. Нанесены вялікія страты ворагам Полацка.

gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

**5. Вяртанне Усяслава ў Полацк.**

**Вучань 1.** У 1068 г. на Кіеўскія землі напалі полаўцы. Князь Ізяслаў змагаўся з імі і пацярпеў паражэнне. Кіяўляне былі абураны бездапаможнасцю князя і яго войска і звярнуліся да Ізяслава з просьбай: «Выдай, князь, зброю і коней, мы яшчэ паб'ёмся з імі (полаўцамі)». Але князь не згадзіўся. Відаць, баяўся, што гэту зброю народ паверне супраць яго і баяр. І ўсё ж кіяўляне кінуліся да цямніцы і вызвалілі Усяслава. Людскія натоўпы павялі яго на княжацкі двор і абвясцілі кіеўскім князем. Усяслаў княжыў у Кіеве толькі сем месяцаў.

Прагнаны з Кіева Ізяслаў звярнуўся па дапамогу да польскага караля Баляслава і на чале польскага войска рушыў на Кіеў. Насустрач яму выступіў з кіеўскім войскам Усяслаў. Але бітва не адбылася, таму што Усяслаў пакінуў войска. Вось як вобразна аб гэтым апавядае «Слова...»: «Скочыў ад іх лютым зверам апоўначы з Белгарада, сінім воблакам ахінуўся».

— Дзе, вы думаеце, ён мог апынуцца? *(У Полацку.)* Князя клікаў яго родны горад, відаць, вялікая журба па бацькаўшчыне перапаўняла яго сэрца. Мяркуюць, што Усяслаў тым самым пазбегнуў полацка-польскай вайны.

**Вучань 2.** Ізяслаў з дапамогай польскага войска вярнуў сабе Кіеў і жорстка расправіўся з прыхільнікамі Усяслава. Набліжаўся пачатак XII ст. Полацкі князь быў вельмі стары і больш не нападаў на суседнія землі. Іншыя князі таксама не трывожылі яго старасць. Зямны шлях 72-гадовага князя завяршаўся; 57 гадоў ён княжыў, 18 з іх — быў у ваенных паходах. Сваім нашчадкам Усяслаў пакідаў шматпакутную Полацкую зямлю не спустошанай і разрабаванай, а магутнай і квітнеючай. Памёр Усяслаў у 1101 г.

У ходзе работы над гэтым матэрыялам вучні запісваюць у свае сшыткі дату смерці Усяслава (1101 г.).

**6. Найвышэйшы ўздым Полацкага княства.**

Вучням прапануецца самастойна прачытаць § 5, с. 84—85 і вярнуцца да лагічнага задання. У графу «Усяслаў» табліцы «Умацаванне Полацкага княства» шасцікласнікі павінны запісаць: «У перыяд княжання Усяслава Полацкая дзяржава дасягнула найвышэйшага ўздыму».

***V. Замацаванне вывучанага.***

— Запоўніце карткі:

1. Характарыстыка князя Усяслава Чарадзея.

| План | Змест |
|---|---|
| Калі і дзе жыў | Княжыў у Полацку ў 1044—1101 гг. |
| Кім быў | Полацкім князем |
| Рысы характару | Энергічны, разумны, кемлівы, рашучы, мог знайсці выйсце з цяжкага становішча |
| Мэта дзейнасці | Умацаванне Полацкага княства |
| Сродкі дзейнасці | Ваенным шляхам |
| Якую карысць прынёс людзям | Змог абараніць Полацкую зямлю |
| Яго найвялікшая заслуга | Полацкая дзяржава дасягнула найвышэйшай магутнасці |

2. Запоўніце пропускі ў сказе: «Першыя летапісныя звесткі пра горад ____________, якія з'яўляецца цяперашняй сталіцай Беларусі, адносяцца да ____________ г., калі дружына полацкага князя ____________ сутыкнулася на рацэ ____________ з войскам кіеўскіх князёў».

3. Запоўніце пропускі ў табліцы:

*Табліца* — **Умацаванне незалежнасці Полацкага княства**

| **Прычыны** | **Выгаднае ____________________** |
|---|---|
| Асноўныя падзеі | ________ г. — першае ўпамінанне пра Полацк.<br>1021 г. — князь Брачыслаў напаў на ____________________.<br>1067 г. — ____________________.<br>1044—1101 гг. — ____________ ____________________. |
| Вынікі | 1. Полацк атрымаў ____________.<br>2. Пры Усяславе Чарадзеі Полацкае княства дасягнула ____________.<br>3. З Полацкам вялі гандаль ____ ____________________. |

***VI. Рэфлексія.***

— Прадоўжыце сказ:

Сёння на ўроку я даведаў(ла)ся, што ___ ____________________________________.

Сёння на ўроку я не зразумеў(ла) _____ ____________________________________.

***VII. Дамашняе заданне:*** **§ 16, пытанні і заданні, с. 85.**

gisdapamoga.by
gisdapamoga.by